

# САВЕТ ЕЎРОПЫ

## АБАРОНЦА ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

РЭЗЮМЭ

COUNCIL OF EUROPE

CONSEIL DE L'EUROPE




## ДЗЯРЖАВЫ-ЧЛЕНЫ

Албанія, Андора, Арменія, Аўстрыя, Азербайджан, Бельгія, Боснія і Герцагавіна, Балгарыя, Венгрыя, Вялікабрытанія, Грузія, Германія, Грэцыя, Данія, Ісландыя, Іспанія, Ірландыя, Італія, Кіпр, Латвія, Ліхтэнштэйн, Літва, Люксембург, Паўночная Македонія, Мальта, Малдова, Манака, Нідэрланды, Нарвегія, Польшча, Партугалія, Румынія, Сан-Марына, Сербія, Славакія, Славенія, Турцыя, Украіна, Фінляндыя, Францыя, Харватыя, Чэшская Рэспубліка, Чарнагорыя, Швецыя, Швейцарыя, Эстонія.

## ДЗЯРЖАВЫ - НАЗІРАЛЬНІКІ

Злучаныя Штаты Амерыкі, Канада, Мексіка, Святы Пасад, Японія.

## ШТАБ-КВАТЭРА І ОФІСЫ

Савет Еўропы мае сваю штаб-кватэру ў Страсбургу, Францыя. У ім занята 2300 чалавек, таксама ен падтрымлівае знешнія офісы ў іншых міжнародных арганізацыях. Еўрапейскія цэнтры моладзі ў Страсбургу і Будапешце прапануюць маладым людзям падрыхтоўку па пытанням дэмакратыі і абароны правоў чалавека.

## БЮДЖЭТ

Агульны бюджэт Савета Еўропы на 2024 год складае €624,6 млн. і ў асноўным фінансуецца дзяржавамі-членамі.



# САВЕТ ЕЎРОПЫ



**Alain Berset**
*Генеральны сакратар*

**Савет Еўропы з'яўляецца вядучай арганізацыяй кантынента па абароне правоў чалавека.**
У склад гэтай арганізацыі ўваходзяць 46 дзяржаў-членаў, у тым усе члены Еўрапейскага саюза. Усе дзяржавы-члены Савета Еўропы падпісалі Еўрапейскую Канвенцыю па абароне Правоў чалавека і асноўных свабод, дамову, распрацаваную для абароны правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства закона.

Еўрапейскі суд па правах чалавека назірае за рэалізацыяй Канвенцыі ў дзяржавах-членах. Фізічныя асобы могуць падаваць скаргі аб парушэннях правоў чалавека ў Страсбургскі суд, калі ўсе магчымасці абскарджання ў адпаведнай дзяржаве-члене вычарпаныя.

Еўрапейскі саюз рыхтуецца падпісаць Еўрапейскую канвенцыю па правах чалавека, для стварэння агульнай еўрапейскай прававой прасторы для больш як 700 мільёнаў грамадзян.



# АБАРОНА ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

ТСавет Еўропы выступае за свабоду слова і сродкаў масавай інфармацыі, свабоду сходаў, роўнасць і абарону меншасцяў. Ён распачаў кампаніі па такіх пытаннях, як абарона дзяцей, онлайн распальванне нянавісці і правы цыганоў - найбуйнейшай меншасці ў Еўропе.

Савет Еўропы дапамагае дзяржавам-членам у барацьбе з карупцыяй і тэрарызмам, і ў правядзенні неабходных судовых рэформ. Яго група канстытуцыйных экспертаў, вядомая як Венецыянская Камісія, прапануе юрыдычныя кансультацыі краінам па ўсім свеце.

Савет Еўропы садзейнічае абароне правоў чалавека ў рамках міжнародных канвенцый, такіх як Канвенцыя аб папярэджанні і спыненні гвалту ў адносінах да жанчын і гвалту ў сям'і і Канвенцыі аб кіберзлачынствах. Ён кантралюе развіццё дзяржаў-членаў у гэтых сферах і робіць рэкамендацыі праз незалежныя экспертныя кантралюючыя органы.

Сёння ні адна  дзяржава-член Савета Еўропы не прымяняе смяротнага пакарання.






# ГЛАБАЛЬНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Органы кантролю

- Група дзяржаў супраць карупцыі (GRECO)
- Еўрапейскі камітэт па папярэджанні катаванняў і бесчалавечнага або зневажальнага абыходжання або пакарання (CPT)
- Група экспертаў па барацьбе з гандлем людзьмі (GRETA)
- Еўрапейская камісія па эфектыўнасці правасуддзя (CEPEJ)
- Камітэт экспертаў па ацэнцы мер барацьбы з адмываннем грошай і фінансаваннем тэрарызму (MONEYVAL)
- Еўрапейская камісія супраць расізму і нецярпімасці (ЕКРН)
- Еўрапейскі камітэт па сацыяльных правах (ЕКСП)
- Кансультатыўны камітэт па Рамачнай канвенцыі аб абароне нацыянальных меншасцяў
- Камітэт экспертаў па Дагавору Еўропы аб рэгіянальных мовах або мовах меншасцяў

Савет Еўропы працуе ў цесным партнёрстве з Еўрапейскім Саюзам і супрацоўнічае з Арганізацыяй Аб’яднаных Нацый, Арганізацыяй па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, а таксама з многімі краінамі-партнёрамі па ўсім свеце.

Напрыклад, Еўрапейскі дырэктарат Савета па якасці лекавых сродкаў і ахове здароўя, які адыгрывае ключавую ролю ў барацьбе з падробленымі лекамі, мае пагадненні з Бразіліяй, Кітаем, Паўднёвай Афрыкай і ЗША.



# СТРУКТУРА

У дадатак да **Еўрапейскага суда па правах чалавека**, Савет Еўропы складаецца з некалькіх дзейнічаючых устаноў.

- **Генеральны сакратар** накіроўвае і прадстаўляе Савет Еўропы.
- **Камітэт міністраў**, які складаецца з міністраў замежных спраў дзяржаў-членаў і іх прадстаўнікоў, выступае ў якасці галоўнага органа, які прымае рашэнні.
- **Парламенцкая Асамблея** складаецца з 612 членаў парламента з 46 дзяржаў-членаў; Асамблея выбірае Генеральнага сакратара, Камісара па правах чалавека і суддзяў Еўрапейскага суда па правах чалавека; яна забяспечвае дэмакратычны форум для дыскусій і назірае за выбарамі; яе камітэты адыгрываюць важную ролю ў разглядзе бягучых пытанняў.
- **Камісар па правах чалавека** незалежна звяртаецца і прыцягвае ўвагу да парушэнняў правоў чалавека.
- **Кангрэс Мясцовых і рэгіянальных Уладаў** адказвае за ўмацаванне мясцовай і рэгіянальнай дэмакратыі. Ён уключае ў сябе 612 абраных прадстаўнікоў, якія прадстаўляюць больш за 150 000 мясцовых і рэгіянальных улад.
- **Канферэнцыя Міжнародных Няўрадавых Арганізацый** прадстаўляе грамадзянскую супольнасць і спрыяе дэмакратызацыі ўдзельнікаў.




**Avenue de l'Europe • 67075 Strasbourg • FRANCE**

Наведайце наш асноўны сайт
**www.coe.int**

Выдавецтва Савета Еўропы website
**book.coe.int**

Дакументацыя і рэсурсы онлайн вэбсайта
**edoc.coe.int**

PREMS 059624 • 2024 © Савет Еўропы •
Фота: Савет Еўропы / Shutterstock • Графічны дызайн: Les Explorateurs

Апублікавана Дырэкцыяй па сувязям